617

НЕЗАЛЕЖНЫ ЧАСОПІС ПРАВАСЛАЎНАЕ МОЛАДЗІ

ПЕРШЫ ГОД ВЫДАНЬНЯ №1

## У ГЭТЫМ НУМАРЫ

ПРАВАСЛАЎНЫЯ АЎТАРЫ
НАВІНЫ ЕПАРХІІ
АДРАДЖЭНЬНЕ ТРАДЫЦЫЙ
СЬПЕВЫ
СЬВЯТЫЯ ЗЯМЛІ БЕЛАРУСКАЙ
СЛОВА РЭДАКТАРА

...Вякі плывуць...
а Ён — раскрыжаваны...
жывы...
у крыві цячэ цьвікоў іржа...
і род людскі,
нячыстым апантаны,
ня мае сілы
зьняць Яго з крыжа...

## Праваслаўныя аўтары

### Зніч

У час апошняе высновы,
дзе Скон глядзіць на нас штодня,
няўжо ня ўславіць наша мова
Сьвятое Божае імя ?

У час сусьветнага садому,
што вар'яцее ад спакус,
блюзьнерыць танна несьвядомы,
маўчыць сьвядомы беларус.

Я буду ў роспачы і ў скрусе,
пакуль ня спраўдзіць гэты сьвет
саюз Царквы і Беларусі —
праз нас,

Уладыка Філарэт !

1983

...з россыпу слоў-крышталю,
прэлюдыяй і высновай,
промнем Хрыстовай хвалі
бліснe

Божае

Слова...



## Уладзімір Караткевіч
### (зь дзёньніка)

18/IV-1982. Нядзеля.

Хрыстос уваскрос! У гэты б дзень сонцу — на ўсё неба, у адрозненне ад пахмурных кучак і каталіцкага вялікадня /я — патрыёт/, а тут лепей, чым у іх, але ўсё адно нічога асаблівага. Неба, праўда, упершыню па-сапраўднаму веснавое, дужа блакітнае, але шмат хмар і ўсяго чатыры градусы цеплыні. Акрамя таго, палякі абазвалі, сказалі, што сёння ў секты хрысціян праваслаўных вялікдзень. Усё жыццё жыву, а не ведаў, што я сектант. Прызнацца, крыўдна, усе хрысціяне ў прынцыпе роўныя. Але я, зноў жа, як хрысціянін, ім дарую.

Усе адно на наш вялікдзень неба сінейшае.

## Навіны Епархіі

На сёньняшні дзень на псаломшчыцкіх курсах пры Менскім Епархіяльным Упраўленьні займаюцца 60 чалавек.
На працягу года яны праслухаюць лекцыі па біблейскай гісторыі, вывучаць богаслужбовы статут, царкоўнаславянскую мову, музычную грамату й галасавыя сьпевы.

•

У 1988 годзе ў краіне зарэгістравана звыш 8000 новых праваслаўных прыходаў. Зь йіх на Беларусі 30.
У тым жа годзе ў рэспубліцы рукапакладзена 32 сьвятары ды 14 дзяканаў.



Библиотека НИПЦ "Мемориал"

# ПРАВАСЛАЎНАЯ ДУМКА

НЕЗАЛЕЖНЫ ЧАСОПІС ПРАВАСЛАЎНАЕ МОЛАДЗІ №2

Валяньціна Аксак.

+++

Чырвоны ходнік пасярод сьвятлынь-пакою
Расьцяў яго раўнюсенька на часьці.
Адкуты мосенж на мае запясьці,
А на яе — Хрыстовае прычасьце.

Чырвоны ходнік пасярод сьвятлынь-пакою,
Хадзіць па ім дазволена абраным.
Атрута змовы на маім каханьні,
А на яе — Хрыстовае прызваньне.

Чырвоны ходнік пасярод сьвятлынь-пакою
Лёг ад мяне і да яе памкнуўся.
Ад мае помсты болей не ратуйся,
І ад яе даўно ўжо Бог зьлякнуўся.

+++

Паўз могілкі мая дарога.
Штодня - заходам і сьвітаньнем
Твой крыж вітаю адвітальна.
Даруй-даруй! Усё — ад Бога.

Рука ў жагнаньні стыне строга
Над месцам нашага расстаньня.
А наўздагон — тваё маўчаньне.
Не наракай! Усё — ад Бога.

Самотных дзён у нас нямнога.
Ужо ўзыходзіць знак астральны
Над месцам нашага спатканьня.
Прымі-прымі! Мяне — ад Бога.

## НАВІНЫ ЕПАРХІІ

Прыгожа адраджаецца старажытны праваслаўны Полацкі манастыр. Новае дыханьне жыцьця з асаблівай сілаю адчувалася ў час сьвята прападобнай Эфрасіньні ігуменьні Полацкай, што адзначалася 5 чэрвеня. Яркі сонечны дзень, залатыя крыжы на белых купалах Уздзьвіжанскага сабору ўзьняліся з руін і рыштаваньняў; невялікі, ужо адрэстаўраваны Трапезны храм і цудоўная стромкая прыгажуня — Спаса-Эфрасінеўская царкоўка, якая з XII стагоддзя да нашых дзён захавала прыгажосьць надзвычайнай чысьціні і сьведчаньне нязломнасьці веры і глыбокай духоўнасьці нашых продкаў. У ёй адбывалася сьвяточная Літургія, якую правіў Мітрапаліт Менскі і Беларускі Філарэт. Праўдзей казаць, яна ішла на дворы, ля Храму, бо народу было вельмі багата. Прыехала і шмат навакольных сьвятароў. Дыяканы чыталі ектаніі ля Храму, дзе стаяў вялікі абраз сьвятой Эфрасіньні, гарэлі сотні сьвечак. Народ, як і стагоддзі таму, прыйшоў да сваёй маці Эфрасіньні з надзеяй і бедамі, зь вялікім спадзяваньнем на ўзнаўленьне яе абіцелі. Таму, мусіць, і Мітрапаліта сустрэлі так надзвычай цёпла і шчыра: ад самой Спаса-Эфрасінеўскай царквы праз увесь двор, ажно да брамы манастыра, выслалі ходнік зь кветак, усклаўшы пасярэдзіне яго шырокую стужку з ружовых піёній. Кветкі несьлі ўсе. Кветкамі і хлебам з сольлю на беларускім ручніку сустрэў народ свайго архіпастыра ...

# ПРАВАСЛАЎНАЯ ДУМКА

НЕЗАЛЕЖНЫ ЧАСОПІС ПРАВАСЛАЎНАЙ МОЛАДЗІ МЕНСК 1989 №3


## НАВІНЫ ЕПАРХІІ

ЗЬ БЕЛАРУСКІХ ЕПАРХІЙ УТВОРАНЫ БЕЛАРУСКІ ЭКЗАРХАТ РУСКАЙ ПРАВАСЛАЎНАЙ ЦАРКВЫ.

ЯГО УЗНАЧАЛЬВАЕ ФІЛАРЭТ, МІТРАПАЛІТ МЕНСКІ І ГРОДЗЕНСКІ, ПАТРЫЯРШЫ ЭКЗАРХ БЕЛАРУСІ.

У Жыровічах пачала дзейнічаць Менская Духоўная семінарыя. З 84-х абітурыентаў выбрана 40, якія і склалі першыя "А" і "Б" класы. Першы "А" клас беларускамоўны, тут выкладаюцца па-беларуску, акрамя роднай мовы, літаратура і біблейская гісторыя. Амаль што усе вучні добра адказваюць па-беларуску. Як нам стала вядома, некаторыя дзеячы беларускай культуры ўжо выказалі сваё жаданьне выкладаць нейкія прадметы аба прачытаць курсы па асобных дысцыплінах. Аб тым, што тут, у праваслаўнай семінарыі, шануюць роднае слова, сьведчыць вялікая колькасьць беларускіх выданьняў, якія выпісаны на семінарыю і закупаюцца для бібліятэкі. Мы запрашаем чытачоў "Праваслаўнай Думкі" дапамагчы семінарыі ў набыцьці беларускіх кніг. Адрас: , Гродзенская вобласьць, Слонімскі раён, г/п Жыровічы, вул. Савецкая. Духоўная семінарыя. Бібліятэка. На кожнай кнізе раім напісаць -- ад каго.

Беларуская мова і літаратура выкладаюцца таксама і ў І-м "Б" ніхто зь іх ня супраць, ніхто ня кажа: навошта мне гэта патрэбна. Знайшоўся і добры настаўнік, былы выкладчык Менскага педінстытута замежных моў, цяпер пенсіянер, Сяргей Рыгоравіч Мацыральнік.

Адзін з найпапулярнейшых выкладчыкаў семінарыі -- а. Сергій Гардун. Родная мова айца Сергія настолькі жывая і мілагучная, што сяму-таму ня грэх у яго павучыцца. Але галоўнае, варта павучыцца ягонай перакананасьці:

-- Я заўсёды лічыў і лічу, што кожны чалавек, кожны народ павінен размаўляць на сваёй роднай мове. І калі хтосьці ставіць пытаньне наступным чынам: навошта ў Беларусі выкладаць па-беларуску? -- я такіх людзей не разумею. Трэба, канешне, згадзіцца з рэальнасьцю, наша мова ў заняпадзе і занядбаньні. Дзякуй Богу, што пачаўся працэс яе адраджэньня, абавязак царквы -- у гэты працэс уключыцца. Вось я са свайго боку і раблю тое, што магу і павінен рабіць.

## ІААН КРАНШТАЦКІ

"Глухой восеньскаю ноччу на 19 кастрычніка /І лістапада па Новым стылі/ 1829 року, на далёкай поўначы, каля берагоў ракі Пінегі, у сяле Сура Архангельскай губэрні Пінежскага павету, за 500 вёрстаў ад Белага мора, у беднай сям'і прычэтніка Ільлі Сяргеева, пры самых нябрачых, сумных абставінах нарадзіўся хлопчык -- кволы

A

# ПРАВАСЛАЎНАЯ ДУМКА

НЕЗАЛЕЖНЫ ЧАСОПІС ПРАВАСЛАЎНАЕ МОЛАДЗІ
МЕНСК 1990 №4

## Ў нумары

+ Упершыню за 70 год Вы можаце прачытаць пасланьне Патрыярха Ціхана.

+ Як заўсёды, сэнсацыйная інфармацыя.

+ Агляд эмігранцкай прэсы. Інфармацыя з усяго сьвету.

+ Дзёньнікі Аляксандра Ельчанінава.

## НАВІНЫ ЕПАРХІІ

+ У Менску пры Упраўленьні Беларускага Экзархату заснавана камісія для перакладу Сьвяшчэннага Пісаньня на беларускую мову. У камісію ўвайшлі самыя аўтарытэтныя беларускія перакладчыкі і літаратары. Сярод іх Васіль Сёмуха, Адам Мальдзіс, Уладзімір Конан і іншыя. Першы варыянт перакладу зроблены В.Сёмухам. На спецыяльных паседжаньнях камісіі абмяркоўваецца кожнае слова перакладу. Неацэнныя паслугі робяць члены камісіі - сьвятары: архімандрыт Стэфан /Менск/, протапрасьвітэр Віталь Баравы /Масква/, іярэй Сергій Гардун, іярэй Алексій Шынкевіч, сьпецыялісты па перакладу Бібліі зь Пецярбурскай Духоўнай Акадэміі.

+ У Менску дзейнічае дзіцячая нядзельная школа пры Кафедральным Саборы. Заняткі — у нядзелю з 16 гадзін. Сінодам Беларускай Праваслаўнай Царквы выказана пажаданьне, каб такія школы дзейнічалі пры кожным саборы на Беларусі.

+ У час наведаньня Гародні для асьвяшчэньня Барысаглебскай /Каложскай/ царквы, Мітрапаліт Філарэт наведаў музей гісторыі рэлігіі, што знаходзіцца ў памяшканьні былога жаночага манастыра. Нам паведамілі, што на сустрэчы з абласным кіраўніцтвам Уладыка паставіў пытаньне аб вяртаньні манастыра Царкве.

+ 4-га сакавіка ў Жыровіцкім манастыры адбылася хіратонія, узвядзеньне ў епіскапства намесьніка Жыровіцкага манастыра архімандрыта Стэфана, нарачэньне на епіскапства — ў суботу, 3 сакавіка ў Кафедральным саборы Менска. На яго мейсца, намесьнікам манастыра і рэктарам семінарыі прызначаны Маслаў, чалавек, вядомы сярод вернікаў як выдатнейшы спавядальнік.

З-за таго, што ў апошні час шматлікія выданьні — сярод іх, нажаль, і царкоўныя — скажаюць сэнс выказваньняў Патрыярха Ціхана ў Пасланьні ад 19 студзеня 1918 року, мы вырашылі прапанаваць Вам поўны тэкст гэтага Пасланьня.

Библиотека НИЦ "Мемориал"

# ПРАВАСЛАЎНАЯ ДУМКА

6'90

НЕЗАЛЕЖНЫ ЧАСОПІС ПРАВАСЛАЎНАЕ МОЛАДЗІ

МЕНСК




1490 1990

Библиотека "Мемориал"